Нацыянальная платформа
Форум грамадзянскай супольнасці
УСХОДНЯГА ПАРТНЁРСТВА

# Заява

## Беларускай Нацыянальнай платформы
## Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства

## ў сувязі з гібеллю людзей у Адэсе і Усходняй Украіне

*6 траўня 2014 года*

Мы, прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў, ініцыятыў, палітычных партый, грамадзяне Беларусі, выказваем спачуванні ўкраінскаму народу ў сувязі з трагічнымі падзеямі 2 траўня, якія пацягнулі за сабой вялікую колькасць пацярпелых і чалавечыя ахвяры, а таксама з нагоды ахвяр баявых дзеянняў, справакаваных сепаратыстамі ва Усходняй Украіне.

Драматызм гэтых падзей складаецца не толькі ў тым, што грамадзяне Украіны загінулі, абараняючы свае натуральныя, неад'емныя правы, цэласнасць роднай краіны, але і ў тым, што ахвярамі трагедыі сталі ашуканыя расійскай прапагандай людзі, якія ўсталі на шлях вайны са сваімі братамі за сумнеўныя каштоўнасці.

Сутыкненняў у Адэсе можна было б пазбегнуць, як і іншых інцыдэнтаў, у выніку якіх загінулі і пацярпелі людзі. Адэскія падзеі паказалі, што сітуацыя падышла да крытычнай рысы, калі простыя грамадзяне аб'ядноўваюцца і становяцца на абарону сваіх каштоўнасцей і жыццяў іншых людзей перад пагрозай сепаратызму і тэрарызму, выкарыстоўваючы ўсе наяўныя ў іх сродкі.

Сепаратызм ва Украіне ўзнік на раней спакойных міжнацыянальных тэрыторыях. Гэтая з'ява ў дадзеным выпадку ўяўляе сабой спробу аддзялення тэрыторый на карысць суседняй дзяржавы. Так званыя паўстанцы ва ўсходніх абласцях Украіны добра ўзброеныя, выкарыстоўваюць дзяржаўную сімволіку суседняй дзяржавы і дзейнічаюць па тым жа сцэнары, які дазволіў Расіі некаторы час таму далучыць Крым. На працягу апошніх тыдняў сепаратысты захоплівалі будынкі, кантралявалі тэрыторыі і ключавыя аб'екты, бралі закладнікаў, утрымлівалі іх у палоне, катавалі і забівалі.

Сітуацыя, што склалася зараз, абавязвае ўрад Украіны зрабіць усё, што ад яго залежыць, для абароны сваіх грамадзян, а пры адсутнасці магчымасцей такой абароны — аказаць максімальнае садзейнічанне іх самаарганізацыі з мэтай забеспячэння бяспекі.

Украіна павінна быць незалежнай, дэмакратычнай і цэласнай дзяржавай. У сітуацыі, калі ў грамадзян Украіны з'явілася магчымасць самім вырашаць лёс сваёй краіны, мы заклікаем іх да кансалідацыі і мірнага, палітычнага дыялогу, для якога ёсць усе неабходныя ўмовы. Мы заклікаем адмовіцца ад навязанай звонку мовы варожасці і ўстаць на шлях пагаднення.

Мы заклікаем Расею спыніць правакацыі і дыверсіі, а таксама агрэсіўную прапаганду і недапушчальную рыторыку, якая адмаўляе ў праве на існаванне суверэннай дзяржаве, адмовіцца ад вайны супраць брацкага ўкраінскага народа. Вайна не прынясе Расіі ні маральных, ні эканамічных дывідэнтаў і балюча ўдарыць па ўсіх сферах, магчымым коштам такога выбару могуць стаць жыцці і лёсы многіх расіян.

Мы заклікаем сусветную супольнасць прыняць меры для садзейнічання ўрэгуляванню сітуацыі, у прыватнасці, накіраваныя на спыненне расійскай агрэсіі ў адносінах да Украіны.

*Беларускія арганізацыі грамадзянскай супольнасці — удзельнікі Беларускай Нацыянальнай платформы Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства (больш за 60 арганізацый)*